# НЕ ПАДКАЧАЙЦЕ, ХЛОПЦЫ!

**Сталі вядомы імёны беларускіх канкурсантаў на “Славянскім базары ў Віцебску”.**

У мінулую суботу адбыліся фіналы нацыянальных адбораў на дарослы і дзіцячы міжнародныя конкурсы, якія традыцыйна праходзяць падчас віцебскага форуму мастацтваў. За права прадстаўляць нашу краіну на прэстыжным музычным фестывалі ў кожнай катэгорыі змагаліся па дзесяць выканаўцаў, якія выйшлі ў фінал адборачнага тура.

Сярод маленькіх артыстаў найлепшы вынік паказаў 12-гадовы Арцём Скароль з Ашмян Гродзенскай вобласці. Хлопчык не першы год займаецца ў Нацыянальным цэнтры музычнага мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна пад кіраўніцтвам Святланы Стацэнкі і мае вопыт выступленняў як у нашай краіне, так і за мяжой, у прыватнасці, у Расіі і Грузіі.

У музычным спаборніцтве сярод дарослых артыстаў не было роўных 27-гадоваму Яўгену Курчычу з Мінска. Спявак, акцёр, лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў выкладае на кафедры мастацтва эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама кіруе шоу-групай “Маракасы”. Вядома, што да сваёй перамогі Яўген ішоў восем гадоў — выканаўца прымае ўдзел у нацыянальным адборы на віцебскі конкурс з 2010 года.


Фота БЕЛТА


Фота БЕЛТА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ